Кірыленка А. Д., студэнт 250 групы
дзённай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Ландзіна Л. У.,
доктар гістарычных навук, дацэнт

# КРЫЛАТЫЯ ГУСАРЫ ЯК АДДЗЕЛ ВОЙСКА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ: ПАХОДЖАННЕ І ФАРМІРАВАННЕ

Вывучэнне гісторыі крылатых гусараў мае некалькі аспектаў актуальнасці. Па-першае, як аб’ект культурнай спадчыны. Крылатыя гусары былі адным з самых папулярных відаў кавалерыі ў гісторыі ваеннага мастацтва. Вывучэнне іх гісторыі дапамагае захаваць і перадаць каштоўныя веды аб ваенным мастацтве, звычаях і традыцыях таго часу. Па-другое, ў якасці прыклада асобнай стратэгіі і тактыкі – крылатыя гусары былі вядомыя сваімі асорбнымі баявымі здольнасцямі, і веданне іх гісторыі дазваляе зразумець, як яны спраўляліся з вайсковымі задачамі. Па-трэцяе, крылатыя гусары выступаюць як выбітны эпізод ваеннай гісторыі шэрагу краін, у тым ліку Вялікага Княства Літоўскага, Польскай Кароны, Расіі, Швецыі і іншых, што карысна для разумення ваеннай справы, палітычных адносінаў і сацыяльных працэсаў ў гэтых краінах. Па-чацвертае, ў практычным аспекце веданне гісторыі крылатых гусараў можа быць карысным для ўласна ваенных гісторыкаў як прыклад развіцця ваеннай справы.

Крылатыя гусары ці гусарыя – элітная кавалерыя Каралеўства Польскага і Рэчы Паспалітай, створаная на мяжы XV–XVI ст., якая дзейнічала на палях бітваў з пачатку XVI да сярэдзіны XVIII ст., спецыялізаваная на «праломванні» строя варожай конніцы. Гэта войска,

якое ўвайшло ў гісторыю, як адно з самых эфектыўных і незвычайных па сваім вонкавым выглядзе.

У 1500 г. на службу да польскага караля паступіла некалькі сербаў. Гэтыя ваяры не насілі браню, спадзяючыся толькі на "асіметрычны" балканскі шчыт і ўзбройваючыся лёгкай пікай. Пазней на службу сталі прымаць венграў, палякаў і літоўцаў, фармуючы першыя роты. Палякамі часцей выкарыстоўваўся тэрмін usar, чым звыклае цяпер hussar [4, с. 3]. Першапачаткова гэта была лёгкая конніца, якая мела ва ўзбраенні шчыты, на якія мацаваліся крылы, падобна войскам турэцкіх наезнікаў “дэлі” – дэкаратыўныя крылы з пёраў дзікіх птушак. Такога роду войскі першапачаткова былі лёгкаўзброенымі ці навогул не насілі даспехаў і ўжываліся для дробных нападаў, выведкі ці аховы.

Па адной з версій, назва “гусары” з’явілася ў 1458 г., калі вугорскі кароль Мацьяш Корвін загадаў для абароны ад турак сабраць адмысловае коннае апалчэнне – у яго набіралі па аднаму салдату ад дваццаці двароў. Па-венгерску “husz” азначае дваццаць, “ar” – дараванне, адсюль і пайшла назва апалчэнцаў – “гусары” [6, с. 1]. Існуе таксама версія, якая ўзыходзіць ажно ў Х ст., да Візантыі. Тады ў візантыйскіх ваенных кіраўніцтвах згадваліся конніцы, якія складаліся з іх балканскіх наймітаў (часцей за ўсё з сербаў), якіх называлі chosarioi або chonsarioi, якія маглі паходзіць ад лацінскага cursors, якое абазначала лёгкую конніцу эпохі ўпаду Рымскай імперыі [4, с. 3]. Такім чынам, тэрмін “гусар” мог з'яўляцца сінонімам слову “бандыт”.

Пры Стэфане Баторыі, які, дарэчы, быў родам з Вугоршчыны, пачаліся змены ў знешнім выглядзе войскаў. Паколькі на радзіме караля і вялікага князя падобныя войскі гусараў былі важнымі для краіны, Баторый першы сярод кіраўнікоў выявіў, што ўзбраенне конніцы ў той час састарэла. Пасля была праведзена ваенная рэформа, пры якой гусары

адмовіліся ад балканскіх шчытоў на карысць металічных нагруднікаў, тым самым стаўшы цяжкаўзброеным тыпам кавалерыі. Таксама ўзбраенне гусар (у прыватнасці дзіда) прыняло характэрны для яго гістарычны выгляд. Менавіта дзіды, а не крылы (якія з’яўляліся неабавязковымі для нашэння), як прынята лічыць, з’яўляліся адметнай рысай польскіх гусараў, і выкарыстоўваліся імі на працягу стагоддзяў [6, с. 2].

Многія віды гусарскіх даспехаў цяжка паддаюцца датыроўцы, паколькі з часам усё часцей абнаўляліся ці наадварот, старая экіпіроўка магла выкарыстоўвацца ў пазнейшы час. Дзякуючы Бохеньскаму і яго даследаванням, накіраваным на класіфікацыю і датыроўку даспех, сёння мы маем магчымасць датаваць тую ці іншую частку ўзбраення з дакладнасцю да 30 гадоў, што дае нам больш падрабязныя звесткі пра часы яе выкарыстання [3, с. 23].

Зразумела, распавядаючы аб крылатых гусарах, абавязкова згадаць іх знакамітыя крылы. Трэба адзначыць, што крылы меліся далёка не ва ўсіх гусараў; па шэрагу сведчанняў яны сустракаліся толькі ў асобных харугвах (перш за ўсё, караля, каралевіча, гетманаў). Дакладнае сведчанне аб з'яўленні крылаў адносіцца да 1574 г. – гэта апісанні каранацыі ў Кракаве Генрыха дэ Валуа.

Пасля рэформы Баторыя і адмены шчытоў некаторы час гусары насілі драўляныя мадэлі крылаў на руках. Да 1575 г. крылы часцей за ўсё сталі мацаваць да задняй лукі сядла. Першапачаткова ў гусар было толькі адно крыло і мацавалася яно з левага боку, каб не перашкаджала трымаць піку, і выглядала яно як прамая рэйка, у якую ў адзін рад утыкаліся пёры. Першыя выявы парных крылаў з'яўляюцца толькі каля 1600 г. [4, с. 17–18]. Аб прызначэнні крылаў ёсць некалькі меркаванняў. Есць меркаванне, што крылы выкарыстоўваліся для запалохвання коней

суперніка. Не трэба забываць і пра тое, што ў сутычках з татарамі крылы перашкаджалі варожым вершнікам захопліваць гусар арканамі са спіны, каб скідаць тых з коней. Таксама можна ўлічыць факт таго, што некаторыя заходнееўрапейскія аўтары XVII ст. прыпісвалі ім нейкі “шумавы” эфект, які ўздзейнічаў на ворага падчас нападу. “Сцвярджаюць, – пісаў Франсуа д'Алерак, які наведаў Польшчу ў 1689 г., – што шум тых крылаў палохае коней непрыяцеля і дапамагае разбіццю яго шэрагаў” [1, с. 5–6]. Аднак, пры здымках Ежы Хофманам фільма “Агнём і мячом”, дзе выкарыстоўвалася вялікая колькасць падобных крылаў, падобнага свісту не было [4, с. 18]. Такім чынам, крылы выкарыстоўваліся для запалохвання, з'яўляючыся сваеасаблівым упрыгожваннем вершнікаў.

Гусарскія дзіды можна па праву назваць найважнейшай зброяй войска, дзякуючы якому яно доўгі час лічылася непераможным. Піка характарызавалася шарападобнай гардай і доўгім дрэўкам, створаным з таннай і лёгкай драўніны і мелым паражніну ўсярэдзіне, каб было лягчэй утрымаць зброю даўжынёй ад 3,8 да 5,6 м. Тым не менш, гэтая зброя з'яўлялася аднаразовай, паколькі ламалася практычна адразу. На дзіды вешаліся вымпелы, якія мелі розную каляровую гаму ў кожнай харугвы. Аднак большасць вымпелаў былі двухколернымі: чырвона-белымі, сіне-белымі, жоўта-чорнымі ці чорна-белымі [4, с. 16–17]. Пасля таго, як ламалася дзіда, гусарамі ў якасці зброі выкарыстоўваліся палаш, канчар, шабля ці чакан. У распараджэнні гусар таксама меліся лукі і пара пісталетаў, якія выкарыстоўваліся значна радзей мячоў. Усё гэта захоўвалася з левага боку: на поясе і пад сядлом [5, с. 5].

Адным з асноўных аддзелаў гусарскіх войскаў была “харугва”, якая налічвала каля сотні коней з двара і падзялялася на пошты (спіскі). Камандаваў такой харугвай ротмістр, у абавязкі якога таксама ўваходзіў

заклік да службы шляхцічаў (“таварышаў”), з якімі ў войска прыходзілі і іх слугі ў асобе дваровых людзей ці ж, у выпадку дастатковай колькасці грошай у шляхціца – з дробнай шляхты. Такіх слуг таварышы маглі самастойна апранаць у браню і выдаваць коней, якіх куплялі на ўласныя грошы. У харугве таварышы станавіліся ў першы шэраг, за імі ішлі іншыя воіны адпаведных поштаў, утвараючы, такім чынам, другую і трэцюю шэрэнгі (колькасць апошніх залежала ад колькасці радавых у пoштах). Кіравалася ўсё гэта ротмістрам і паручнікам, прычым менавіта апошні непасрэдна камандаваў войскам, паколькі пасада ротмістра з’яўлялася свайго роду тытульным званнем. У некаторых выпадках у адсутнасць камандуючага з ліку таварышаў прызначаўся “намеснік”. Таксама варта пазначыць пасаду харунжага, які з'яўляецца трэцім па званні ў харугве. Харунжымі станавіліся заслужаныя таварышы, якім дазвалялася насіць ротны сцяг, аднак гэтая пасада не дазваляла лічыцца афіцэрам [1, с. 2].

Крылатыя гусары пачыналі атаку з адлегласці прыкладна ў 100 крокаў. Іх тактыка "праломвання" ворагаў складала ў сабе напад на вялікай хуткасці на войска суперніка, прабіваючы сабе шлях наперад доўгімі пікамі. Калі тыя ламаліся – у ход ішлі палашы і шаблі, прыводзячы эскадрон да блізкага бою [2, с. 1]. Зыходзячы з прызначэння крылаў, якія палохалі чужых коней, гусары папросту выбівалі іх са строю, тым самым разбураючы варожую абарону.

Да XIX ст. самай буйнай бітвай у Еўропе была бітва пад Берасцечкам у 1651 г. Для ўдзелу ў ёй сабралася не менш за паўмільёна ўзброеных людзей. Войскі польскага караля Яна Казіміра Вазы перамаглі казакоў і саюзных ім татараў. Вялікая колькасць ваяроў тлумачыцца ў тым ліку прысутнасцю ў шэрагах польскага войска шматлікай свабоднай чэлядзі [5, с. 6–7].

Гусарамі ў большасці сваёй з'яўляліся багатыя шляхцічы, якія мелі магчымасць купляць сабе браню і мець лепшых коней. Такія шляхцічы былі выхадцамі з вясковых маёнткаў, якія, час ад часу, маглі рабіцца цэнтрам таварыскага і збольшага палітычнага жыцця, але таксама з’яўляючыся бясплатным заезным дваром. Статус гусара амаль заўсёды быў вельмі высокі. Тыповы гусарскі таварыш – гэта адукаваны, які ўмее чытаць, пісаць і ведае латынь багаты шляхціц, уладальнік ад адной да трох вёсак. Служба ў харугве патрабавала самых розных уменняў, куды ўваходзілі ўменне ездзіць на кані і валоданне многімі відамі зброі [5, с. 7–8].

Ужо да пачатку XVII ст. са складу заходнееўрапейскіх армій знікла цяжкая конніца. У Рэчы Паспалітай жа, у сілу таго, што яе тэрыторыя з'яўлялася адносна раўніннай і зручнай для такога віду войскаў, крылатыя гусары існавалі некалькі даўжэй, няхай і на спадзе сваіх сіл. З часам шведскае войска пачало ўсё часцей атрымліваць перамогу над гусарамі. Першым значным паражэннем лічыцца бітва пад Мітаў ў жніўні 1622 г., дзе гусары аказаліся няздольныя нават пачаць атаку, прыціснутыя агнём шведскай артылерыі. Пазней гусарскія харугвы будуць пераўзброеныя, будуць пазбягаць шведскай арміі. Тым не менш, да канца XVII ст. войска паспяхова ваюе з рускімі і туркамі.

У 1775 г. сойм скасаваў гусарства. Гусары, прыдатныя да ваеннай службы, былі зведзены ў брыгады нацыянальнай кавалерыі [4, с. 31–32]. Можна сказаць, што нейкі час тыя маглі выступаць у парадней форме на вяселлях ці святах, перш чым назаўжды знікнуць як адзінка войскаў Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што польска-літоўская гусарыя – гэта ўзорны від кавалерыі, адзін з найбольш эфектыўных у гісторыі, і безумоўная частка беларускай ваеннай гісторыі і

нацыянальнага гонару беларускага народа. Дзякуючы падобнаму віду войскаў Рэч Паспалітая выдатна паказала сябе на баявой арэне Еўропы, а таксама прадаставіла мноства вялікіх асоб у ваеннай гісторыі. Падаецца, што беларусы павінны ведаць аб гэтым, наколькі вялікае войска некалі існавала на тэрыторыі іх краіны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Васильев, А. Польско-литовская гусария XVII века / А. Васильев // Цейхгауз, 1998. – №7. – С. 2–6.

2. Дабравольскі, А. Д. Крылатая гусарыя Каралеўства Польскага і Рэчы Паспалітай / А. Д. Дабравольскі // Информационные технологии и управление : материалы 54-й научной конференции аспирантов, магистрантов и студентов, Минск, 23–27 апреля 2018 г. / Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники. – Минск : БГУИР, 2018. – С. 145.

3. Киселёв, В. И. Армия Польши 1569–1696 / В. И. Киселёв // Новый солдат : военно-исторический альманах, 2002. – №158. – С. 23.

4. Киселёв, В. И. Польские крылатые гусары 1576–1775 / В. И. Киселёв // Новый солдат : военно-исторический альманах, 2002. – №142. – С. 3, 16–18, 31–32.

5. Сикора, Р. Польские крылатые гусары / Р. Сикора. – Москва : РОССПЭН : Политическая энциклопедия, 2020. – С. 5–8.

6. Страпко, А. Ю. Польская «крылатая» гусария: история появления и развития тяжелой кавалерии в Речи Посполитой / А. Ю. Страпко // Материалы 1-й международной научно-практической конференции, Пинск, 15–16 сентября 2022 г. / Белорусский

государственный педагогический университет имени Максима Танка. – Минск : БГПУ, 2022. – С. 1–2.

Клебча Е. Р., магистрант
дневной формы обучения
Научный руководитель – Шаройко Е. Н.,
кандидат искусствоведения, доцент

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ САКРАЛИЗАЦИИ ОБЩЕСТВЕННОЙ ПАМЯТИ В МОНУМЕНТАЛЬНОЙ ПЛАСТИКЕ БЕЛАРУСИ

Монументальная пластика является формой сакрализации, средством увековечивания исторических событий, сохранения в памяти людей важных для государства личностей и определения для общества необходимых ценностей. Монументы, памятники и многообразные памятные знаки вошли в современную среду городов и стали их неотъемлемой частью. Монументальная пластика дает представление о сути пространственно-объемного единства природы вещей, в полной мере способна выразить новые идеи, представить те трансформации, которые происходят во времени, она создает пластический образ эпохи, формируя его тенденции.

Тягчайшие потери и бедствия, трагические последствия войны, народный героизм и подвиг – все это нашло воплощение в произведениях монументальной пластики Беларуси. Они в совокупности представляют не только летопись исторического подвига народов, но открывают новый этап развития художественного мышления, исполненный многообразия средств и приемов художественной